# САМЫЯ ДОБРЫЯ ПЕСНІ НАЛЕЖАЦЬ ТАБЕ...

***Чалавек – гэта асобная старонка кнігі пад назвай «Жыццё», кожны са сваёй своеасаблівай гісторыяй і непаўторным лёсам. Сярод іх – Анатоль Мікалаевіч Канапелька, знакаміты паэт, перакладчык, былы выкладчык нашага ўніверсітэта, якому 15 лістапада споўнілася б 80 гадоў.***

Каб прыгадаць жыццё і творчасць таленавітага чалавека, Вольга Іванаўна Русілка, дацэнт кафедры літаратуры, загадчык народнага літаратурнага музея, разам са студэнтамі



С.І. Федаровіч.

філалагічнага факультэта вырашыла правесці у чытальнай зале бібліятэкі музычна-літаратурную імпрэзу «Самыя добрыя песні належаць табе...».

Сцэнарый да святочнай сустрэчы мне давялося пісаць самой. Прызнацца, было няпроста, таму што гэта быў мой першы вопыт падрыхтоўкі, арганізацыі і правядзення такога мерапрыемства.

Упершыню пра А.М. Канапельку студэнты нашай групы пачулі ад нашага выкладчыка В.І. Русілкі. Яна расказала, як Анатоля Мікалаевіча любілі і паважалі студэнты, заўсёды з задавальненнем хадзілі на яго лекцыі і практычныя заняткі.

Потым я сустрэлася з



жонкай паэта Святланай Іванаўнай Федаровіч. Яна ўспамінала любімага мужа толькі цёплымі словамі. Святлана Іванаўна расказала, што на працягу жыцця яны былі заўсёды разам. Яна працавала ў школе настаўніцай замежнай мовы. І нават у паходы са школьнікамі Святлана Іванаўна хадзіла разам з Анатолем Мікалаевічам. А яшчэ жонка А.М. Канапелькі паказала мне фотаздымкі, на якіх я пазнала выкладчыкаў нашага ўніверсітэта Віктара Віктаравіча Здольнікава, Леаніда Міхайлавіча Вардамацкага, Ганну Міхайлаўну Мезенку.

У Анатоля Мікалаевіча былі цесныя сувязі з Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатрам імя Якуба Коласа. Паэт быў уважлівым гледачом, яго заўсёды запрашалі на рэпетыцыі, раіліся. А ён па магчымасці з задавальненнем хадзіў на ўсе тэатральныя прэм'еры. Дарэчы, у рэпертуары коласаўцаў ёсць спектакль «Руслан і Людміла», для якога вершы А.С. Пушкіна пераклаў Анатоль Канапелька.



На сустрэчы, якая прайшла 15 лістапада ў чытальнай зале нашай бібліятэкі, з уступным словам выступіў дэкан філалагічнага факультэта, доктар педагагічных навук Сяргей Уладзіміравіч Нікалаенка. Потым студэнты расказалі пра жыццёвы шлях, творчую дзейнасць Анатоля Мікалаевіча, прачыталі яго вершы, а трэццякурсніца Алеся Мажэйка выканала аўтарскую песню на словы А.М. Канапелькі.

Алена Сяргееўна



Дзядова, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства, была студэнткай Анатоля Мікалаевіча. На імпрэзе яна падзялілася сваімі ўспамінамі пра выдатнага выкладчыка і проста добрага чалавека.

«Анатоль Мікалаевіч Канапелька ўмеў бачыць у сваіх студэнтах і калег тое, што не заўважалі многія іншыя выкладчыкі. Ён быў вельмі ўважлівым да кожнага чалавека. Аднойчы ў майго аднакурсніка здарылася вялікае гора: яго бацькі загінулі ў аўтакатастрофе. Мы сядзелі на лекцыі ў Анатоля Мікалевіча, раптам адчыніліся дзверы і ўвайшла сакратар дэканата. Паклікала мяне, як старасту, і расказала гэтую сумную навіну. Дадала, што я павінна сама ўсё сказаць гэтаму хлопцу. Я вярнулася ў аўдыторыю і не ведала, што мне рабіць. Усю пару не пісала, а толькі думала, як мне гэта сказаць свайму сябру. Анатоль Мікалаевіч усё бачыў. І, калі я падышла, каб падпісаць журнал, выкладчык спытаў у мяне, чаму я не пісала лекцыю, і што ў мяне здарылася. Не ведаючы, што рабіць, я расказала яму пра гэтае здарэнне. Ён адразу ж выпраставўся так па-бацькоўску і паабяцаў, што сам усё расказа. Тады ўпершыню журнал застаўся не падпісаны. У той дзень я прыйшла дадому і, падзяваючы ўражаная, напісала замалёўку «Непадпісаны журнал».

Успомніўся і яшчэ адзін эпізод, звязаны з Анатолем Мікалаевічам. Тады я працавала з завочнікамі ў другую змену. Закончылася апошняя пара. Было амаль што восем гадзін вечара, ва ўніверсітэце ўжо нікога не засталося. І тут адчыніліся дзверы, увайшоў Анатоль Мікалаевіч, а за спіной у яго быў букет гваздзікоў. Я неяк нават сумелася: у такі позні час ён прыйшоў з кветкамі. Што за падзея? Дзень нараджэння ж у мяне вясной. І тут Анатоль Мікалаевіч сказаў: «Леначка, я хачу цябе павіншаваць. Ты – мая першая студэнтка, якая абараніла дысертацыю і стала дыпламаваным кандыдатам навук. Пасля гэтага мы яшчэ доўга з ім гаварылі. Асабіста для мяне Анатоль Мікалаевіч адкрыў літаратуру, якая стала маім захапленнем на ўсё жыццё».

Таксама успомніць такога таленавітага чалавека прыйшлі яго знаёмыя: Святлана Мікалаеўна Дашкевіч, загадчык трупы Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, і актрыса Раіса Сцяпанаўна Грыбовіч.

«Слова Анатоля Мікалаевіча Канапелькі і сёння нас саграває, лучыць, вучыць, як і раней», – адзначыла Вольга Іванаўна Русілка.

Выдатны чалавек Анатоль Мікалаевіч Канапелька і зараз жыве ва ўспамінах многіх выкладчыкаў і студэнтаў нашага ўніверсітэта.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**

**Фота Алесі Дуброўскай.**